МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

## ЗАГАД

## ПРИКАЗ

15.06.2020 № 93

г. Мінск

г. Минск

Аб выніках XXVIII рэспубліканскага конкурса ”Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры“

На падставе пункта 18 Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскага конкурса ”Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры“, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52,

ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць пераможцаў XXVIII рэспубліканскага конкурса ”Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры“:

1.1. у намінацыі ”За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем“:

1.1.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Лёзненскую цэнтральную раённую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Віцебскай вобласці;

сельскую бібліятэку аграгарадка Кальчуны дзяржаўнай установы культуры ”Ашмянская раённая бібліятэка“ Гродзенскай вобласці;

1.1.2. дыпломам другой ступені і грашовай прэміяй ў памеры 40 базавых велічынь раённую дзіцячую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Быхаўскага раёна“ Магілёўскай вобласці;

1.1.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй ў памеры 30 базавых велічынь дзяржаўную ўстанову культуры ”Цэнтральная гарадская бібліятэка г.Жодзіна“ Мінскай вобласці;

1.2. у намінацыі ”За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы“:

1.2.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры ”Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы“ Брэсцкай вобласці;

Зак. 850.

Поразаўскую бібліятэку-цэнтр краязнаўства дзяржаўнай установы культуры ”Свіслацкая раённая бібліятэка“ Гродзенскай вобласці;

1.2.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры ”Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка“ Мінскай вобласці;

Сялецкую сельскую бібліятэку-філіял дзяржаўнай установы культуры ”Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма“ Брэсцкай вобласці;

1.2.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры ”Смаргонская раённая бібліятэка“ Гродзенскай вобласці;

Грабянецкую бібліятэку-клуб дзяржаўнай установы ”Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка“ Мінскай вобласці;

1.3. у намінацыі “За пошукавую і даследчую працу”:

1.3.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Гродзенскую гарадскую цэнтральную бібліятэку імя А.Макаёнка дзяржаўнай установы культуры ”Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Гродна“;

Казлоўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Светлагорская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

1.3.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Ф.Праскурава дзяржаўнай установы культуры ”Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Брэсцкай вобласці;

Сасноўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Віцебскай вобласці;

1.3.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.І.Герцэна дзяржаўнай установы ”Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля“;

Лунінскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Брэсцкай вобласці;

1.4. у намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання”:

1.4.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры ”Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы“ Мінскай вобласці;

Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я.Чачота дзяржаўнай установы культуры ”Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Брэсцкай вобласці;

1.4.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры ”Слонімская раённая бібліятэка імя Я.Коласа“ Гродзенскай вобласці;

Бабіцкую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Чачэрская цэнтральная раённая бібліятэка“ Гомельскай вобласці;

1.4.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

Дрыбінскую дзіцячую бібліятэку-філіял дзяржаўнай установы культуры ”Дрыбінская бібліятэчная сетка“ Магілёўскай вобласці;

Астрынскую гарпасялковую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры ”Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі“ Гродзенскай вобласці.

2. Прысудзіць заахвочвальныя грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь:

Іванаўскай дзіцячай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры ”Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І.Панфёрава“ Брэсцкай вобласці;

філіялу ”Гарадская дзіцячая бібліятэка імя А.П.Гайдара“ дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці;

філіялу ”Мастоўская раённая дзіцячая бібліятэка“ дзяржаўнай установы культуры ”Мастоўская раённая бібліятэка“ Гродзенскай вобласці;

Заастравецкай сельскай бібліятэцы-філіялу дзяржаўнай установы ”Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка“ Мінскай вобласці;

Новасаматэвіцкай сельскай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры ”Бібліятэчная сетка Касцюковіцкага раёна“ Магілёўскай вобласці;

Цэнтральнай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна дзяржаўнай установы культуры ”Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ Віцебскай вобласці;

дзяржаўнай установе культуры ”Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка“ Мінскай вобласці;

Макеевіцкай сельскай бібліятэцы-музею дзяржаўнай установы культуры ”Клімавіцкая бібліятэчная сістэма“ Магілёўскай вобласці;

Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы дзяржаўнай установы ”Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Мінска“;

Мачулішчанскай пасялковай бібліятэцы дзяржаўнай установы ”Мінская раённая цэнтральная бібліятэка“ Мінскай вобласці.

3. Кантроль за выкананнем сапраўднага загада ўскласці на першага намесніка Міністра Карчэўскую Н.У.

Міністр Ю.П.Бондар